# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*Т.М.МІКУЛІЧ*

## ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ АДАПТАЦЫЯ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСАЎ У XX ст.

XX ст. — важны этап у нацыянальным развіцці беларусаў. Менавіта ў пачатку XX ст. беларускі этнас аформіўся як этнасацыяльны арганізм, які ўяўляе сабою вышэйшую форму існавання этнічнай супольнасці, што грунтуецца на пэўнай тэрытарыяльна-дзяржаўнай і сацыяльна-эканамічнай еднасці.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. стварыла ўмовы для нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на беларускіх землях. Фарміраванне тэрыторыі нашай дзяржавы расцягнулася на чвэрць стагоддзя. Афармленне дзяржаўна-тэрытарыяльнай прасторы беларусаў суправаджалася распаўсюджваннем літаратурнай беларускай мовы, агульнабеларускай культуры, этноніма “беларусы”, замацаваннем нацыянальнай самасвядомасці.

У XX ст. беларусы прайшлі праз раздзел іх тэрыторыі і існаванне на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў Заходняй Беларусі ў межах Польшчы (1921—1939 гг.). Вялікі ўплыў на нацыянальныя працэсы на тэрыторыі Беларусі аказала другая сусветная вайна (1939—1945 гг.). У 20-я і 90-я гг. мінулага стагоддзя беларусы зведалі дзве значныя хвалі актывізацыі працэсаў развіцця беларускай мовы, культуры, самасвядомасці. Такая актыўная нацыянальна-культурная палітыка атрымала назву “беларусізацыя”. У канцы XX ст. Рэспубліка Беларусь атрымала статус суверэннай дзяржавы. Беларусь набыла палітычную незалежнасць пасля распаду СССР у 1991 г. Такім чынам, натуральнае імкненне кожнай нацыі да набыцця ўласнай незалежнай дзяржаўнасці поўнасцю рэалізавана беларусамі.

Нацыянальнае развіццё любога этнасу абумоўлена шэрагам фактараў, уплыў якіх на розных этапах і на розных узроўнях нацыянальных працэсаў неаднолькавы. Сярод такіх фактараў — дэмаграфічныя, сацыяльна-палітычныя, дзяржаўна-тэрытарыяльныя, рэлігійныя, моўныя, псіхалагічныя, культурна-мастацкія і інш. Калі разглядаць культуру ў самым шырокім сэнсе слова, а менавіта як сукупнасць усіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, створаных людзьмі ў працэсе гістарычнага развіцця, то відавочна, што нацыянальнае развіццё этнасу ўяўляе перш за ўсё культурнае развіццё этнічнай супольнасці на сваёй вышэйшай стадыі.

У параўнанні з іншымі тыпамі супольнасцей (дзяржаўна-палітычнымі, культурна-моўнымі, рэлігійнымі, тэрытарыяльнымі, сацыяльна-прафесійнымі, антрапалагічнымі, традыцыйна-этнічнымі) нацыянальныя вылучаюцца як тып, што аб’ядноўвае ў пэўнай ступені ўсе названыя супольнасці. Этнічная аснова нацыі дазваляе разглядаць яе як вышэйшую гістарычную стадыю развіцця этнічнай супольнасці. Нацыя характарызуецца афармленай нацыянальнай ідэяй, якая адлюстроўвае лёсавызначальныя інтарэсы народа, акрэслівае перспектыўныя праблемы яе жыццядзейнасці. Самасвядомасць супольнасці на ўзроўні нацыі з’яўляецца найбольш развітой і ў структурным, і ў змястоўным плане ў параўнанні з самасвядомасцю этнічных супольнасцей ніжэйшага ўзроўню. Але фарміраванне этнічнай самасвядомасці любога ўзроўню адбываецца перш за ўсё на аснове культурных асаблівасцей.

У другой палове XX ст. у навуцы былі закладзены асновы сістэмнага аналізу. Сістэмны падыход аказаўся вельмі актуальным, ён дазволіў вывесці навуковыя даследаванні на якасна новы тэарэтычны ўзровень. Апошнія дзесяцігоддзі вызначыліся глыбокімі распрацоўкамі сістэмнай метадалогіі і выкарыстаннем яе навукоўцамі, у тым ліку ў гуманітарна-культуралагічнай сферы [2, 4, 5]. З сістэмнай метадалогіяй цесна звязана праблема адаптацыі. Яе глыбокае разуменне магчыма толькі ў межах сістэмнага мыслення.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Базавыя характарыстыкі любой сістэмы вызначаюцца яе элементамі, сувязямі і адносінамі паміж імі. Складанасць сістэмы вагаецца ў вельмі шырокіх межах. Найбольшай складанасцю вызначаюцца біялагічныя і сацыяльныя сістэмы, якія характарызуюцца самаразвіццём. Вышэйшы тып складаных сістэм прадстаўлены так званымі "мэтанакіраванымі сістэмамі". Сістэмы, якія адносяцца да дадзенага тыпу, здольныя да самазахавання і развіцця шляхам самаарганізацыі, самакіравання, самааптымізацыі (грамадства, асоба). Нацыя з'яўляецца мэтанакіраванай сістэмай. Яна ўсведамляе свае інтарэсы, імкнецца захаваць яе своеасаблівасці.

Сістэмная арганізацыя этнічнага свету дазваляе разглядаць этнічныя супольнасці з пункту гледжання адаптыўнасці – якасці, якая ўласціва любой структуры. Вучэнне аб сістэмах сведчыць, што мера ўстойлівасці структуры ёсць мера яе адаптыўнасці. Адаптацыя можа быть вызначана як працэс і вынік прыстасавання сістэмы да ўмоў навакольнага асяроддзя.

Адаптыўныя працэсы заўсёды накіраваныя на набыццё новай якасці, якая здольная забяспечыць дадзенаму ўтварэнню (арганізму) рэальна магчымае існаванне ў межах пэўнага асяроддзя. Адаптацыя – гэта паступовае змяненне аб'екта, звязанае са з'яўленнем новых элементаў са знешняга асяроддзя і якаснымі зменамі ў структуры сістэмы.

Этнічныя супольнасці рэагуюць на змяненне знешніх умоў выпрацоўкай перш за ўсё новых культурных элементаў. Менавіта з дапамогай культуры этнічныя супольнасці актыўна прыстасоўваюцца да ўмоў асяроддзя. Пад знешнім асяроддзем, з якім узаемадзейнічае этнас, трэба разумець і прыроднае, і сацыяльнае. А адаптыўны закон, што дзейнічае на ўзроўні этнічнай сістэмы (этнічнага аб'екта), набывае характар этнічнай адаптацыі.

Этнічная адаптацыя, такім чынам, – гэта працэс прыстасавання этнічнага аб'екта (этнічная супольнасць, этнафор) да новых ландшафтных, этнічных, дзяржаўна-палітычных, сацыяльна-эканамічных і іншых умоў жыццядзейнасці праз эвалюцыю яго элементаў (мова, духоўная культура, матэрыяльная культура, этнічная самасвядомасць і інш.). Пры гэтым, калі глядзець на этнічную сістэму ў статыцы, яе элементы з'яўляюцца адначасова і вынікам адаптацыі.

Механізм этнічнай адаптацыі ляжыць у сферы традыцый. Традыцыі – гэта своеасаблівы генафонд этнічнасці, які падтрымлівае непаўторнасць этнасу. Дваякая функцыя этнічнай адаптацыі заключаецца ў захаванні вопыту, што дазваляе этнасу нармальна існаваць у канкрэтнай прасторавай і часавай сітуацыі, а таксама ў накапленні новага вопыту, новых якасцей у зменлівых умовах знешняга асяроддзя. Такім чынам, адбываецца страта традыцыйнасці ў выніку непазбежных навацый. Змяненні ў этнічнай сістэме, якія прыводзяць да з'яўлення варыянтнай сістэмы, ёсць плата за захаванне сістэмнай цэласнасці ў новых умовах.

Штучная кансервацыя этнічных асаблівасцей супярэчыць іх функцыянальнай прыродзе. Парушэнне натуральнага механізму захавання старых і фарміравання новых традыцый вядзе да страты этнічнай сістэмай адаптыўных здольнасцей, а значыць, і зніжэння жыццядзейнасці этнасу як сацыяльнага калектыву, які асвоіў пэўнае асяроддзе.

Што ж адбываецца з этнічнымі калектывамі, у якіх назіраюцца прасторава-часавыя змяненні? У іх ідзе працэс накаплення новых з'яў, якія змяняюць рысы этнічных супольнасцей. Па зменах у мове, культуры, этнічнай самасвядомасці можна назіраць паступовую эвалюцыю народаў-этнасаў. І калі ўмовай этнічных змен з'яўляецца знешняе асяроддзе, якое само непазбежна мяняецца, то фактарам, што абумоўлівае этнічную рэакцыю на гэтае асяроддзе, выступае здольнасць этнасу як высокаарганізаванай дынамічнай сістэмы да адаптацыі.

Этнічная гісторыя, такім чынам, – гэта гісторыя эвалюцыі адаптыўных механізмаў і накаплення адаптыўнага вопыту, развіцця сродкаў адаптацыі і вынік рэальна магчымых праяў працэсу адаптацыі. Этнічная гісторыя сведчыць аб бесперапыннай барацьбе этнасу за захаванне сваёй этнічнай спецыфікі і адначасова адлюстроўвае бесперапыннае адмаўленне яе. Варыятыўныя этнічныя супольнасці, якія ўзнікаюць на асобных этапах гісторыі этнасу, з'яўляюцца вынікам працэсу этнічнай адаптацыі. І не дзіўна, што першапачатковы этнас не можа быць такім, як яго наступныя варыянты.

Этнакультурная адаптацыя з'яўляецца часткай этнічнай адаптацыі ў шырокім сэнсе слова і закранае змяненні мовы і культуры. Эвалюцыя культурных элементаў вядзе да ўзнікнення навацый. Самыя жыццеўстойлівыя навацыі з часам могуць замацавацца і ўвайсці ў лік культурных традыцый этнасу, а значыць, фарміраваць яго аблічча. Якасныя змяненні, што адбываюцца ў выніку этнакультурнай адаптацыі, вядуць да змяненняў у сістэме этнічнай самасвядомасці. Менавіта ў этнічнай самасвядомасці адлюстроўваюцца ўсе сутнасныя асаблівасці этнасу, а яго эвалюцыя добра дэманструе дзейнасць адаптыўнага закону.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змены этнасу з улікам працэсаў этнакультурнай адаптацыі прасочым на прыкладзе эвалюцыі мовы. Мова з’яўляецца адной з асноўных этнічных прымет. У звычайных абставінах мова, уласцівая пэўнаму этнасу (этнічная мова), выконвае асноўныя камунікатыўныя і сігнікатыўныя функцыі для прадстаўнікоў дадзенага этнасу і выступае этнічным сімвалам. У самасвядомасці этнафораў яна фіксуецца ў якасці роднай. Факт супадзення роднай мовы з этнічнай сведчыць аб аднароднасці этнічнай самасвядомасці, аб супадзенні этнакультурных арыентацый з этнічнай прыналежнасцю. Самасвядомасць этнафораў, якім характэрна такая этнамоўная тоеснасць, з’яўляецца найбольш устойлівай.

Гісторыя нацыянальнага развіцця беларусаў у XX ст. сведчыць, што да канца 50-х гг. павялічвалася колькасць беларусаў, якія лічылі роднай мову сваёй нацыянальнасці. Так, згодна перапісу 1959 г., 93,1% беларусаў назвалі роднай беларускую мову [3, с.148]. Але этнічная кансалідацыя беларусаў ішла паралельна з міжэтнічнай інтэграцыяй у межах Саюза ССР. У моўнай сферы інтэграцыйныя працэсы вялі да пашырэння маштабаў выкарыстання рускай мовы. Палітыка беларусізацыі 20-х гг., якая была фактычна згорнута ў пачатку 30-х гг., не прывяла да радыкальных змен у моўнай сітуацыі ў гарадах, дзе з другой паловы XIX ст. панавала руская мова. Павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва вяло да павелічэння насельніцтва, якое размаўляла на рускай мове. У канцы 50-х гг. мінулага стагоддзя бацькам дазволілі самім выбіраць мову навучання дзяцей. Ва ўмовах падзення прэстыжу беларускай мовы, якая не мела такой дзяржаўнай падтрымкі, як руская, па Беларусі пракацілася хваля закрыцця беларускамоўных школ. У выніку колькасць беларусаў, якія лічылі роднай мову сваёй нацыянальнасці, скарацілася з 90,1% у 1970 г. да 80,2% у 1989 г. [3, с.148–149].

Згодна перапісу насельніцтва 1989 г., у Беларусі ў выніку актыўных этнамоўных узаемадзеянняў пры значнай ролі рускай мовы склалася сітуацыя, калі значная частка прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей назвала роднай мову іншага этнасу. Сярод іх 19,8% беларусаў назвалі роднай рускую мову. Уплыў беларускага этнасу на іншыя этнічныя групы, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі, таксама можна прасачыць па тым, што 63,9% палякаў, 20,9% татар, 13,8% літоўцаў назвалі роднай беларускую мову. Такім чынам, згодна перапісу 1989 г. этнакультурныя арыентацыі каля двух мільёнаў чалавек у Беларусі аказаліся звязанымі з этнасамі, да якіх яны не належаць [3, с.149].

Калі этнічныя суб’екты трапляюць у новыя ўмовы, яны вымушаны прыстасоўвацца да іх, каб захаваць свае сацыяльныя пазіцыі. Такім чынам актывізуюцца адаптыўныя працэсы. Пад уздзяннем дэмаграфічных (міграцыі), дзяржаўна-палітычных (утварэнне шматнацыянальнай дзяржавы, новая культурна-моўная палітыка) або іншых фактараў этнас (яго частка) можа быць уцягнуты ў маштабныя міжэтнічныя ўзаемадзеянні. Моўная сфера абавязкова рэагуе на новыя ўмовы развіцця этнічнай супольнасці. Назіраюцца шматлікія моўныя пераймання, білінгвізм і масавая моўная асіміляцыя.

Моўная асіміляцыя азначае пераход на іншую мову як асноўную і адлюстраванне гэтага факта ў этнічнай самасвядомасці. Новыя моўныя рэаліі фіксуюцца самасвядомасцю этнафораў, і ў якасці роднай мовы выступае ўжо іншаэтнічная мова. Моўная асіміляцыя з’яўляецца першым крокам да поўнай этнічнай асіміляцыі. Структура этнічнай самасвядомасці спачатку на ўзроўні асобных прадстаўнікоў этнасу, а потым і на ўзроўні этнасу адлюстроўвае змены, якія адбыліся ў выніку такой этнакультурнай (у прыватнасці, этнамоўнай) адаптацыі.

20—30-я гг. XX ст. увайшлі ў гісторыю беларусаў як перыяд дзяржаўна-тэрытарыяльнага раз’яднання. Больш за 4 млн. чалавек, што пражывалі на тэрыторыі плошчай 108 тыс. кв. км, якая адносіцца сёння да Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, а таксама да некалькіх раёнаў Мінскай і Віцебскай, згодна Рыжскай мірнай дамовы 18 сакавіка 1921 г. паміж Савецкай Расіяй і Польшай, адышлі да Польшы.

Менавіта дзяржаўна-палітычны фактар выклікаў з’яўленне своеасаблівых рыс сярод насельніцтва Заходняй Беларусі. Своеасаблівасць палітычнага, сацыяльна-эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. заключалася ў адсутнасці ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці і развіцці вытворчых адносін, заснаваных на прыватнай уласнасці, фарміраванні капіталістычнай эканомікі, заахвочванні асабістай ініцыятывы.

Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў Заходняй Беларусі таксама адрозніваліся ад аналагічных працэсаў ва Усходняй Беларусі. Польскія ўлады не былі зацікаўлены ў распаўсюджванні беларускай этнічнай самасвядомасці на землях Заходняй Беларусі і праводзілі палітыку паланізацыі. Каналамі паланізацыі выступалі каталіцкая царква, польская школа, друк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Моўная палітыка польскіх улад, а таксама непасрэдныя кантакты мясцовага насельніцтва з палякамі садзейнічалі значнаму распаўсюджванню на заходнебеларускіх землях беларуска-польскага двухмоўя. Насельніцтва, асабліва гарадское, паступова ўцягвалася ў сферу польскамоўнай культуры і каштоўнасцей, якія панавалі ў Польшчы ў той час.

Разам з тым асіміляцыйныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў адзначаны перыяд не паспелі закрануць большай часткі мясцявага насельніцтва. Невысокі ўзровень развіцця капіталізму на далучаных землях і захаванне адсталых формаў гаспадарання, якія абмяжоўвалі сацыяльна-эканамічную і культурную актыўнасць людзей, садзейнічалі захаванню традыцыйнай культуры. Вынікам этнасацыяльнага развіцця насельніцтва Заходняй Беларусі ў 20 – 30-я гг. стала павелічэнне колькасці асоб з невыразнай этнічнай самасвядомасцю. Лічбы польскага перапісу сведчаць, што ў 1921 г. у Палескім ваяводстве зафіксавана 375,2 тыс. беларусаў і 38 тыс. чалавек, якія назвалі сябе «тутэйшыя», а праз 10 гадоў – ужо толькі 75,4 тыс. назвалі сябе беларусамі і 707,1 тыс. тутэйшымі [6, с.183].

Асаблівасцю этнічнага жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі з’явілася і значная этнаразмежавальная роля рэлігіі. Вядомы тэзіс “каталік – гэта паляк”, які прапагандаваўся польскімі святарамі, меў сваім вынікам асіміляцыю тысяч этнічных беларусаў.

Калі весці гаворку аб ролі рэлігіі ў жыцці насельніцтва Заходняй Беларусі, трэба заўважыць, што захаванне там культавых пабудоў у перыяд актыўнага разбурэння іх у Савецкай Беларусі мела пэўнае значэнне для фарміравання асаблівага “твару” прадстаўнікоў гэтага рэгіёну. Рэлігійнасць на захадзе Беларусі да сённяшняга часу вышэй, чым у яе ўсходняй частцы. Аб гэтым сведчыць, у прыватнасці, большая колькасць праваслаўных, каталіцкіх храмаў і абшчын на захадзе Беларусі, а таксама і пратэстанцкіх, згодна даных 1970 і 1994 гг. [1, с. 29—32]. Несумненна, што на характар этнакультурных працэсаў на тэрыторыі сучаснага заходняга рэгіёна, які гістарычна звязаны з Заходняй Беларуссю 1921 – 1939 гг. і Літоўскай, Чорнай Руссю папярэдніх стагоддзяў, значны ўплыў аказвае працяглае ўзаемадзеянне на гэтай зямлі беларусаў, палякаў, літоўцаў.

Гісторыя заходняга рэгіёну Беларусі добра ілюструе той факт, што фарміраванне лакальнай групавой спецыфікі – гэта працэс, які абапіраецца на перманентную адаптацыю насельніцтва да мясцовых умоў жыццядзейнасці і выпрацоўку ў яго пэўных сацыякультурных асаблівасцей.

Нацыянальнае развіццё беларусаў у XX ст. дэманструе жыццяўстойлівасць іх як нацыі, здольнасць прыстасоўвацца да новых умоў пры захаванні асноўнага ядра культурна-моўных асаблівасцей. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў з’яўляецца аформленай сістэмай з пачатку XX ст. і актыўна ўплывае на нацыянальныя працэсы ў Беларусі. Пад уздзеяннем нацыянальнай самасвядомасці асобныя этнакультурныя прыкметы, у прыватнасці мова, матэрыяльная, духоўная культура, могуць “адраджацца”, узнаўляць свае страчаныя функцыі, пашыраць арэал распаўсюджання. Працэс беларусізацыі, які адбываўся ў 20-я гг.XX ст. і які ў агульных рысах знайшоў сваё паўтарэнне ў пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя, пачынаўся менавіта з актывізацыі нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Апошняя стымулявала цікавасць да роднай мовы, гісторыі і культуры.

Этнічная самасвядомасць заўсёды імкнецца ўвасобіць у жыццё ўсе свае элементы і такім чынам захаваць стабільнасць этнасу. Але кожны наступны перыяд развіцця этнасу не падобны на папярэдні. Этнічная супольнасць, як любая сістэма, павінна развівацца, змяняцца, прыстасоўвацца да новых умоў для таго, каб захавацца ў сваёй цэласнасці з мінімальнымі стратамі. Этнакультурная адаптацыя пры гэтым выступае як асноўная прычына змяненняў у этнічнай сістэме і эвалюцыі этнічнай самасвядомасці.

---


*1. Беларусы:* Этнагеаграфія, дэмаграфія, дыяспара, канфесіі: Атлас / Рэдкал.: С.А.Польскі (старшыня) і інш. — Мн.: Мінская картаграфічная фабрыка, 1996.— 33 с.

*2. Каган М.С.* Системный подход и гуманитарное знание. – Л.: Изд-во ЛГУ, 1991.

*3. Мікуліч Т.М.* Мова і этнічная самасвядомасць.—Мн.: Навука і тэхніка, 1996. — 159 с.

*4. Мікуліч Т.М.* Сістэмна-гістарычны падыход у этналагічных даследаваннях // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманітарных навук. – 1998. – № 2. — С. 103–108.

*5. Пименов В.В.* Системный подход к этносу (к постановке проблемы) // Расы и народы: совр. этнич. и расовые проблемы: Ежегод. / Отв. ред. И.Р.Григулевич. – М.: Наука, 1996. — С. 12–30.

*6. Этнаграфія* беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / Бандарчык В.К., Чаквін І.У., Углік І.Г., Церашковіч П.У., Каспяровіч Г.І. — Мн.: Навука і тэхніка, 1985. — 215 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ